**Кулакоў, Ф.** Берэт і зорка на абеліску / Ф. Кулакоў // Дняпроўская праўда (Дуброўна). — 2003. — 22 лют. — С.2.

## БЕРЭТ І ЗОРКА НА АБЕЛІСКУ

*З поля на сельскія могілкі налятаў калючы ветрык, церушыў з соснаў сняжком. Толькі да адной магілкі была пратаптана сцежка, тут сабралася чалавек дваццаць, не меней. Былі і малыя, аднаго дык неслі на руках.*

*Сышліся ўсе каля сціплага помніка, дзе пахаваны воін-інтэрнацыяналіст Мікалай Іванавіч Ісакаў. Біяграфія яго вельмі кароценькая. Нарадзіўся 31 студзення 1964 года. Вучыўся у Валяўкоўскай васьмігадовай школе, скончыў Смаленскае ГПТВ па спецыяльнасці слесар-мантажнік. 3 красавіка 1983 года служыў у паветрана-дэсантных войсках у г. Рукле Літоўскай ССР. 29 красавіка 1984 года загінуў пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане. Пахаваны ў в. Каробкі Валяўкоўскага сельсавета. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воину-интернационалисту от благодарного афганского народа».*

Вось і ўсё. Сёння яму яшчэ б не было і сарака, а ўжо столькі гадоў родныя прыходзяць на яго магілу. І цяпер пажылая жанчына адной рукой маўкліва абдымала халодны абеліск, выціраючы другой гарачую слязу. Плакала без голасу, адным сэрцам. Так плачуць толькі маці, у якіх ніколі не адгарыць боль па сваёй крывінцы.

— Я памятаю, – ціха расказвала потым загадчыца аддзела інфармавання райвыканкома Святлана Пятроўна Каржаева, – як прывезлі Мікалая ў цынкавай труне. Я тады працавала ў райкоме камсамола, вось і выпала на маю долю быць на пахаванні. Суправаджаў нябожчыка старшына з яго часці, усё было па-вайсковаму скупа і строга. Кацярына Яўціхаўна значна маладзейшай была, невыноснага гора не таіла, але трымалася з мужнасцю, якая ўласціва хіба толькі жанчынам-сялянкам, якіх ніколі не песціла жыццё.

Штогод у Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў прыязджае дэлегацыя з раёна ў Каробкі. З таго, 1984 года, не прапусцілі ні разу. Як сказаў старшыня арганізацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў настаўнік Мікалай Махначоў, на Дубровеншчыне пражывае паўсотні былых воінаў-інтэрнацыяналістаў, у асноўным тых, хто ўдзельнічаў у баявых дзеяннях у Афганістане. У пасляваенны час смерцю храбрых загінуў адзін з іх – Мікалай Ісакаў. Так супала, што калі адзначаецца Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, маці Мікалая (бацькі яго ўжо няма) адзначае свой дзень нараджэння. На гэты раз ёй споўнілася роўна 75 гадоў.

На могілках аб гэтым не гаварылі. Там, пасля таго, як кароценькія пранікнёныя прамовы сказалі Святлана Пятроўна Каржаева і раённы ваенны камісар падпалкоўнік Уладзімір Дзмітрыевіч Красеў, традыцыйная кругавая чарка пайшла ў памяць загінуўшага воіна – вернага сына Айчыны. На абеліску змешчаны яго партрэт, вянчаюць абеліск зорка з нержавеючага металу і блакітны берэт – прадмет асаблівай гордасці воінаў-дэсантнікаў.

Аддаўшы даніну памяці, усе паехалі ў вёску... Трэба скззаць, што дарога ад могілак была добра расчышчана. А ў вестыбюлі Валяўкоўскага сельскага Савета побач са стэндам з прозвішчамі землякоў-франтавікоў размясцілі асобны, прыгожа афармлены стэнд памяці Мікалая Ісакава. Гэта добра прадумана і вельмі павучальна для моладзі, бо служэнне інтарэсам Айчыньг заўседы было і будзе важнейшым абавязкам мужчыны…

...Дом Кацярыны Яўціхаўны прыкметны ў вёсцы Каробкі. Каля яго спыняецца аўталаўка і тут збіраецца ўся веска. Калі трэбам пачакаць, то ў доме знойдзецца прытулак кожнаму. На гэты раз дом запоўнілі самыя блізкія людзі Кацярыны Яўціхаўны. Былі таксам прадстаўнікі з Дуброўна – У. Красеў, С. Каржаева, М. Махначоў, старшыня Валяўкоўскага сельскага Савета А. Команаў, некалькі мясцовых былых воінаў-афганцаў.

Усе сардэчна віншавалі Кацярыну Яўціхаўну, дарылі каштоўныя падарункі, а дзеці прывезлі і тут жа ўключылі новенькі каляровы тэлевізар.

Жанчына аж трошачкі саромелася ад такой увагі да яе асобы, але скрозь сум па сыну не магла схаваць і радасці.

Што ж, жыццё не спыніць, не павярнуць назад. А ўсё ж няхай у жыцці простай сялянскай жанчыны будзе больш светлых мінут.

**Фёдар Кулакоў**